# Ключавыя кампетэнцыі беларускага вучня

# Перадумовы і мэты

Рамка ключавых кампетэнцый беларускага вучня была распрацавана беларускімі адукатарамі ў 2024 годзе па выніках вывучэння міжнароднага і замежнага досведу рэфармавання зместу школьнай адукацыі ў рэчышчы кампетэнтнаснага падыходу і грамадскага абмеркавання апублікаванага праекта нацыянальнай канцэпцыі ўніверсальных кампетэнцый дзяцей і моладзі.

Рамка, зыходзячы з ідэй беларускай нацыянальна-моўнай і еўраатлантычнай цывілізацыйнай ідэнтычнасці, выдзяляе восем ключавых кампетэнцый, неабходных для самарэалізацыі асобы, здаровага і ўстойлівага ладу жыцця, працаўладкавання, актыўнай грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнай інтэграцыі. Вынікам адукацыі з’яўляюцца паслядоўна сфармаваныя/ набытыя кампетэнцыі, якія з’яўляюцца крытэрыямі ацэнкі якасці адукацыі.

Рамка з'яўляецца арыенцірам для зацікаўленых бакоў у сферы адукацыі і навучання. Яна дае агульнае ўяўленне аб кампетэнцыях, неабходных сёння і ў будучыні, і зыходзіць з таго, што ўсе навучэнцы павінны цалкам раскрыць свой патэнцыял.

Рамка дэманструе пералік і апісанне ключавых кампетэнцый беларускага вучня. Ключавыя кампетэнцыі ўсталёўваюць набор сістэмных характарыстык для праектавання адукацыйных стандартаў і навучальных праграм, вучэбнай і метадычнай літаратуры, а таксама адпаведных вымяральнікаў узроўняў падрыхтаванасці навучэнцаў.

Рамка КК дапаможа вырашыць наступныя задачы, актуальныя для беларускай сістэмы школьнай адукацыі:

- нацэленасць на фармаванне ключавых кампетэнцый навучэнцаў навукова-метадычнага забеспячэння, якое выкарыстоўваецца ў адукацыйным працэсе;
- дасягненне навучэнцамі адукацыйных вынікаў, якія носяць кампетэнтнасны і практыка-арыентаваны характар;
- абнаўленне патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый педагагічных работнікаў, якія ўключаюць персанальную і прафесійную гатоўнасць і падрыхтаванасць да фармавання ключавых кампетэнцый у навучэнцаў;
- развіццё сістэмы ацэнкі адукацыйных вынікаў, арыентаванае на дыягностыку і ацэнку ўзроўня сфармаванасці ключавых кампетэнцый навучэнцаў;
- стварэнне інавацыйнага адукацыйнага асяроддзя, якое забяспечвае фармаванне ключавых кампетэнцый у навучэнцаў.

## Ключавыя кампетэнцыі

Ключавыя кампетэнцыі – гэта дынамічная камбінацыя ведаў, навыкаў і каштоўнаснага стаўлення, неабходных асобе для самарэалізацыі, сацыяльнай інклюзіі, грамадзянскай актыўнасці, паспяховага працаўладкавання і бесперапыннага навучання ў сучасным глабалізаваным і зменлівым свеце.

### • Веды

Веды складаюцца з паняццяў, фактаў і лічбаў, ідэй і тэорый, якія ўжо прыняты і якія забяспечваюць разуменне ў пэўнай вобласці ці прадмеце.

### • Навыкі

Навыкі разглядаюцца як здольнасць выконваць дзеянні і выкарыстоўваць існуючыя веды для дасягнення вынікаў.

### • Каштоўнасць/Стаўленне

Стаўленне ўключае погляды, спосабы мыслення, каштоўнасці, якія вызначаюць схільнасць і здольнасць дзеяння ці рэакцыю на ідэі, асобы або сітуацыі. Выяўляецца ў сітуацыі выбару.

---

## Важна:

1. Складнікамі ключавых кампетэнцый з’яўляюцца веды, навыкі, стаўленне/каштоўнасці.
2. Веды з’яўляюцца асновай, фундаментам кожнай кампетэнцыі.
3. Такія базавыя (ці скразныя) навыкі, як крытычнае мысленне, уменне вырашаць праблемы, праца ў камандзе, камунікатыўнасць, творчы падыход, уменне весці перамовы, кантраляваць эмоцыі і праяўляць стрэсаўстойлівасць з’яўляюцца неад’емнай часткай кожнай з ключавых кампетэнцый.
4. Развіццё каштоўнасцей – адна з найважнейшых мэт адукацыі, таму што каштоўнасці складаюць ядро ідэнтычнасці чалавека, праяўляюцца ў выбары і дзейнасці асобы.
5. Ключавыя кампетэнцыі развіваюцца на працягу ўсяго жыцця ў фармальных і нефармальных, традыцыйных і нетрадыцыйных формах навучання ў розных асяроддзях, уключаючы сям'ю, школу, працоўнае месца, суполкі і інш.
6. Усе ключавыя кампетэнцыі лічацца аднолькава важнымі і ўзаемапранікальнымі, і асноўныя складнікі адной кампетэнцыі будуць садзейнічаць развіццю другой

# Пералік і азначэнні ключавых кампетэнцый

Вылучаецца сем ключавых кампетэнцый, неабходных для самарэалізацыі асобы, здаровага і ўстойлівага ладу жыцця, працаўладкавання, актыўнай грамадзянскай пазіцыі і сацыяльнай інтэграцыі.

## Пералік ключавых кампетэнцый беларускага вучня:

- Шматмоўная
- Прыродазнаўчая, матэматычная, тэхнічная і экалагічная
- Лічбавая
- Персанальная, сацыяльна-эмацыйная і здаровага ладу жыцця
- Грамадзянская
- Прадпрымальніцкая
- Культурная

## Шматмоўная кампетэнцыя

здольнасць ідэнтыфікаваць, разумець, выражаць, ствараць і інтэрпрэтаваць паняцці, пачуцці, факты і меркаванні на роднай мове і іншых мовах у вуснай і пісьмовай формах, выкарыстоўваючы візуальны, аўдыя-/ гукавы і лічбавы матэрыял у розных сферах і кантэкстах; карыстацца рознымі мовамі для камунікацыі і з'яўляцца правадніком паміж рознымі мовамі і сродкамі масавай інфармацыі ў шырокім спектры сацыяльных і культурных кантэкстаў у залежнасці ад патрэб і жаданняў чалавека.
Гэта кампетэнцыя мае на ўвазе не толькі веданне граматыкі, лексікі і правіл мовы, але і разуменне культурных аспектаў, звязаных з рознымі мовамі. У выніку шматмоўная кампетэнцыя дапамагае асобе эфектыўна самарэалізавацца ў шматмоўным свеце, падтрымліваць узаемадзеянне ў розных культурных кантэкстах, што важна ў сучасным глабалізаваным грамадстве.
Мовы – гэта не толькі сродак камунікацыі, але і носьбіт культуры і ідэнтычнасці. Шматмоўная кампетэнцыя спрыяе міжкультурнаму паразуменню, памяншае бар'еры ў зносінах паміж рознымі народамі і супольнасцямі.

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- пра слоўнікавыя адзінкі і базавую граматыку розных моў;
- пра асноўныя віды мастацкіх і публіцыстычных тэкстаў;
- пра асноўныя асаблівасці розных стыляў мовы і камунікатыўных сітуацый.
- пра грамадскія ўмовы, культурны аспект і варыятыўнасць моў.

Веды ўключаюць лінгвістычныя асновы, такія як граматыка, лексіка і фанетыка моў, а таксама веды пра культуры, якія звязаны з гэтымі мовамі. А таксама разуменне таго, як мовы функцыянуюць і як выкарыстоўваюцца ў розных кантэкстах, у тым ліку на ўзроўні міжкультурнай камунікацыі.

### Навыкі

- разумець вусныя паведамленні, пачынаць, працягваць і завяршаць размову, а таксама чытаць, разумець і складаць пісьмовыя паведамленні на розных узроўнях валодання мовамі і ў залежнасці ад індывідуальных патрэб;
- здольнасць ужываць моўныя веды, у тым ліку чытаць, пісаць, слухаць і гаварыць на розных мовах;
- навыкі пераключэння паміж мовамі ў залежнасці ад сітуацыі, моўнага асяроддзя або патрабаванняў камунікацыі;
- выкарыстоўваць рэсурсы і вывучаць мовы таксама ў нефармальнай форме ў рамках бесперапыннага навучання.

### Стаўленне/каштоўнасці

- павага да культурнай і моўнай разнастайнасці, інтарэс і зацікаўленасць рознымі мовамі і міжкультурнай камунікацыяй, пазітыўнае стаўленне да вывучэння і выкарыстання розных моў;
- павага да асобы кожнага чалавека, нягледзячы на яго ўзровень валодання мовай, у тым ліку павага да роднай мовы асоб, якія належаць да меншасцей і/ці маюць міграцыйнае паходжанне, а таксама павага да дзяржаўнай мовы (мовам) краіны.

## Навуковая, тэхнічная і экалагічная (кампетэнцыі ў галіне матэматыкі, навукі, тэхнікі, тэхналогій і экалогіі)

здольнасць развіваць і прымяняць матэматычнае мысленне, навуковыя веды, тэхналогіі і тэхніку для вырашэння паўсядзённых праблем, тлумачыць прыродныя з’явы, выкарыстоўваючы сукупнасць ведаў і навуковых метадаў, у тым ліку назіранне і эксперымент; разуменне важнасці захавання прыроды для забеспячэння ўстойлівага развіцця грамадства.

### Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

#### Веды

- ведаць лікі, вымярэнні, структуры, асноўныя матэматычныя аперацыі і мадэлі;
- разумець тэрміны і паняцці, галоўныя законы з’яў прыроды, тэхналогій, іх прадуктаў і працэсаў, а таксама разуменне ўплыву навукі, тэхналогіі, тэхнікі і дзейнасці чалавека на прыродныя змены і экалогію;
- усведамленне становучых і адмоўных бакоў, а таксама рызык, звязаных з уплывам навуковых дасягненняў і ўздзеяннем тэхналогій на экалогію і грамадства (зыходзячы з прыярытэту каштоўнасцей, пытанняў маралі, культуры і працэсаў прыняцця рашэнняў і інш.)

#### Навыкі

- прымяняць асноўныя матэматычныя прынцыпы і алгарытмы пры вырашэнні паўсядзённых задач дома і на працы;
- выкарыстоўваць логіку і рацыянальны падыход для праверкі гіпотэзы, адрозніваць асноўныя рысы навуковага даследавання;
- праводзіць даследаванні, у тым ліку назіранні і эксперыменты;
- аналізаваць і інтэрпрэтаваць лагічныя сувязі элементаў дадзеных, прадстаўленых у розных формах (тэкст, малюнак, схема, формула, табліца, графік, дыяграма);
- выкарыстоўваць тэхналагічныя інструменты і прылады, а таксама навуковыя дадзеныя з мэтай дасягнення выніку або для прыняцця абгрунтаванага рашэння ці фармулёўкі высновы.

#### Стаўленне/каштоўнасці

- пазітыўнае стаўленне да навукі з апорай на павагу да аб’ектыўнасці і гатоўнасць шукаць прычыны і ацэньваць іх грунтоўнасць;
- клопат пра этычныя праблемы навукова-тэхнічнага прагрэсу і падтрымка бяспекі навакольнага асяроддзя;
- асэнсаванасць, матывацыя і здольнасць адказна і рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы, асабістая адказнасць за захаванне навакольнага асяроддзя.

## Лічбавая кампетэнцыя

упэўненае, крытычнае і адказнае выкарыстанне лічбавых тэхналогій і ўзаемадзеянне з імі для навучання, працы і ўдзелу ў грамадскім жыцці – інфармацыйная пісьменнасць і медыяпісьменнасць (стварэнне лічбавага кантэнту (у тым ліку праграмаванне), бяспека (уключаючы лічбавую і кібербяспеку), пытанні, звязаныя з інтэлектуальнай уласнасцю, вырашэнне праблем і крытычнае мысленне).

### Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- ведаць асноўныя прынцыпы, механізмы і логіку, якія ляжаць у аснове лічбавых тэхналогій, асноўныя прынцыпы работы розных прылад, праграмнага забеспячэння і сетак;
- разумець, як лічбавыя тэхналогіі могуць падтрымліваць камунікацыю, творчасць і інавацыі, і асэнсоўваць іх станоўчыя і адмоўныя бакі.

### Навыкі

- шукаць і атрымліваць доступ да інфармацыі і карыстацца паслугамі, прапанаванымі ў інтэрнэце;
- выкарыстоўваць, атрымліваць, выбіраць, ацэньваць, ствараць, праграмаваць і абменьвацца лічбавым кантэнтам;
- карыстацца і абараняць інфармацыю, базы дадзеных і персанальныя дадзеныя, а таксама распазнаваць і эфектыўна ўзаемадзейнічаць з праграмным забеспячэннем, прыладамі, штучным інтэлектам і робатамі.

### Стаўленне/каштоўнасці

- рэфлексіўнае і адкрытае стаўленне да развіцця лічбавых тэхналогій;
- крытычнае стаўленне да праўдзівасці, надзейнасці і ўплыву інфармацыі і дадзеных, якія існуюць дзякуючы лічбавым тэхналогіям;
- павага да законнасці і этычнага выкарыстання ІТ.

## Персанальная, сацыяльна-эмацыйная і здаровага ладу жыцця

здольнасць да самааналізу, да эфектыўнага размеркавання часу і інфармацыі, да канструктыўнага супрацоўніцтва з іншымі, устойлівасць да стрэсаў, кіраванне ўласным навучаннем і кар'ерай; самасвядомасць і самакантроль, сацыяльная дасведчанасць, клопат пра фізічнае і псіхічнае здароўе.

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- ведаць складнікі фізічнага і псіхічнага здароўя і здаровага ладу жыцця;
- разумець нормы і правілы паводзін, якія прыняты ў розных грамадствах і асяроддзях;
- разумець моцныя і слабыя бакі ўласных навыкаў і найбольш эфектыўныя для сябе стратэгіі навучання і паводзін у залежнасці ад уласных патрэб.

### Навыкі

- бачыць свае магчымасці і засяродзіць увагу на іх, праяўляць стрэсаўстойлівасць і спраўляцца з цяжкасцямі;
- праяўляць настойлівасць у навучанні, канцэнтраваць увагу на больш важных мэтах; арганізоўваць сваё навучанне, ацэньваць сваю працу і звяртацца за парадай, інфармацыяй і падтрымкай, калі гэта неабходна;
- весці канструктыўную размову ў розных абставінах, працаваць у камандзе і весці перамовы, ісці на кампраміс;
- праяўляць эмпатыю і талерантнасць, разуменне розных пунктаў гледжання, а таксама ствараць сітуацыю поспеху і ўменне суперажываць.

### Стаўленне/каштоўнасці

- прыняцце ўнікальнасці і каштоўнасці жыцця;
- прыняцце ўласнай адказнасці за вынікі свайго навучання, выбар стратэгій, свае памылкі і поспехі;
- прытрымліванне маральных каштоўнасцей пры рашэнні жыццёвых задач;
- пазітыўнае стаўленне да ўласнага сацыяльнага і фізічнага дабрабыту і працэсу навучання на працягу ўсяго жыцця;
- жаданне прымяняць набытыя веды і жыццёвы вопыт, а таксама зацікаўленасць у пошуку магчымасцей для навучання і развіцця ў розных сферах жыцця.

## Грамадзянская кампетэнцыя

здольнасць паўнавартасна ўдзельнічаць у грамадскім і сацыяльным жыцці, адказна паводзіць сябе ў грамадстве і ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, сыходзячы з каштоўнасці культуры дэмакратыі і павагі да годнасці і правоў іншых.

### Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- веданне і крытычнае ўспрыняцце асноўных паняццяў і з'яў, якія маюць дачыненне да асобы, супольнасцей, грамадства, дзяржавы, палітыкі, эканомікі, і права, культуры, рэлігіі;
- веданне сутнасці, крытычнае ўспрыняцце, разуменне значэння і каштоўнасці дэмакратыі, правоў чалавека, ролі дзяржавы і няўрадавых арганізацый у жыцці для развіцця грамадства;
- веданне і крытычнае ўспрыняцце асноўных падзей і разуменне тэндэнцый нацыянальнай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі;
- разуменне ролі СМІ ў дэмакратычным грамадстве;
- разуменне полікультурнасці свету і пытанняў нацыянальнай ідэнтычнасці.

### Навыкі

- эфектыўна ўзаемадзейнічаць з іншымі ў дачыненні да пытанняў, звязаных з грамадскімі інтарэсамі;
- фармуляваць аргументаваныя доказы і канструктыўна ўдзельнічаць у грамадскай дзейнасці, у тым ліку ў прыняцці рашэнняў на розных узроўнях, ад мясцовага і нацыянальнага да еўрапейскага і міжнароднага;
- аналізаваць і крытычна ацэньваць інфармацыю, прадстаўленую ў СМІ, распазнаваць праявы прапаганды і выбіраць спосабы барацьбы з ёй;
- не дапускаць гвалт і браць на сябе адказнасць.

### Каштоўнасці/стаўленне

- павага да прыватнага жыцця і правоў чалавека як асновы дэмакратыі і баланс паміж асабістымі і грамадскімі інтарэсамі;
- любоў да роднага краю і краіны, імкненне да іх росквіту;
- гатоўнасць і жаданне ўдзельнічаць у дэмакратычным працэсе прыняцця рашэнняў на розных узроўнях грамадскай дзейнасці;
- павага і гатоўнасць да абароны суверэнітэту і незалежнасці беларускай дзяржавы;
- гатоўнасць і рашучасць абараняць правы законнымі сродкамі.

# Прадпрымальніцкая кампетэнцыя

здольнасць дзейнічаць у адпаведнасці з магчымасцямі і ідэямі з мэтай ператварэння іх у каштоўнасці, якая заснавана на творчасці, праяўленні ініцыятывы і настойлівасці, здольнасці супрацоўнічаць з мэтай работы над праектамі, якія маюць культурную, сацыяльную або фінансавую каштоўнасць.

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- веды пра эканоміку, фінансы і сацыяльна-эканамічныя магчымасці, а таксама праблемы, якія могуць з’яўляцца ў працаўніка, арганізацыі ці грамадства;
- веды пра падыходы да планавання і кіравання праектамі, якім неабходны разнастайныя рэсурсы;
- веды аб нормах і этычных праблемах, звязаных з бізнэсам;
- разуменне, як прадпрымальнікі могуць стварыць пазітыўныя змены, напрыклад, з дапамогай справядлівага гандлю або сацыяльнага прадпрымальніцтва.

### Навыкі

- планаваць і арганізоўваць вырашэнне пастаўленай праблемы, дэлегаванне задач іншым;
- ацэньваць і вызначаць свае моцныя і слабыя бакі, а таксама ацэньваць рызыкі і прымаць іх, калі яны апраўданыя;
- аналізаваць і прымаць рашэнні, ператвараць ідэі ў дзеянні;
- эфектыўна камунікаваць, весці перамовы, спраўляцца з сумневамі, неадназначнымі сітуацыямі і рызыкамі.
- у выпадку патрэбы заснаваць уласнае бізнэс-прадпрыемства і кіраваць ім.

### Каштоўнасці/стаўленне

- пачуццё ініцыятывы, адданасці справе ў доўгатэрміновай перспектыве, смеласці і настойлівасці ў дасягненні мэт;
- жаданне матываваць іншых і паважаць іх ідэі, суперажываць і клапаціцца пра іншых людзей;
- пачуццё адказнасці за ўласны поспех на рынку працы;
- клопат пра навакольнае асяроддзе, этычную адказнасць на працягу ўсяго працэсу прадпрымальніцкай дзейнасці.

## Культурная кампетэнцыя

здольнасць творча праяўляць ідэі, сэнсы, пачуцці у розных мастацкіх формах: музыцы, літаратуры, выяўленчым мастацтве і г.д; дасведчанасць у культурнай сферы і актыўны ўдзел у культурным жыцці.

## Базавыя веды, навыкі і стаўленне, якія маюць дачыненне да кампетэнцыі

### Веды

- веды пра мясцовую, нацыянальную, рэгіянальную, еўрапейскую і сусветную культуру і яе праяўленні, у тым ліку мову, спадчыну, традыцыі, творы мастацтва і культурныя прадукты;
- разуменне розных спосабаў узаемадзеяння творчых ідэй са стваральнікам, удзельнікам і гледачом у межах пісьмовых, друкаваных і лічбавых тэкстаў, а таксама ў такіх мастацкіх формах, як тэатр, кіно, танец, відэагульні, жывапіс і дызайн, музыка, традыцыйнае мастацтва, архітэктура і мастацтва ў змешаных формах;
- разуменне, як развіваецца ўласная і нацыянальная ідэнтычнасць і захоўваецца культурная спадчына ў межах сусветнай культурнай разнастайнасці і ўяўленне аб тым, як мастацтва і формы культуры могуць быць сродкамі пазнання свету.

### Навыкі

- ацэньваць і атрымліваць задавальненне ад твораў мастацтва, суадносіць свае ўласныя творчыя і выразныя пункты гледжання з меркаваннямі іншых;
- самавыяўленне з дапамогай розных мастацкіх форм у адпаведнасці з уласнымі інтарэсамі і здольнасцямі;.
- развіццё творчых навыкаў, якія могуць быць перанесены ў розныя прафесійныя кантэксты.

### Каштоўнасці /стаўленне

- стаўленне да ўласнай ідэнтычнасці як асновы для адкрытасці і павагі да разнастайнасці культурнага самавыяўлення і полікультурнасці сучаснага свету;
- зацікаўленасць сферай культуры і творчасці і жаданне набываць культурны вопыт;
- этычны і адказны падыход да інтэлектуальнай уласнасці і культурнай спадчыны.

# Падтрымка развіцця ключавых кампетэнцый

**Развіццё ключавых кампетэнцый характарызуецца наступнымі асаблівасцямі:**

- адным з вымярэнняў кампетэнтнасці з'яўляюцца каштоўнасныя адносіны. Каштоўнасці лепш за ўсё раскрываюцца ў выбары і дзейнасці вучня. Яны паказваюць, ці каштоўнасці інтэрналізаваны або проста дэклараваны;
- асобасныя характарыстыкі, таленты і схільнасці вучняў, школьная і хатняя абстаноўка аказваюць значны ўплыў на навучанне і развіццё кампетэнцый. Ад уважлівасці і падтрымкі настаўнікаў залежыць самаадчуванне вучня на ўроку і яго пасяховасць у вучобе. Пры навучанні памылкі непазбежныя, таму важна стварыць адукацыйнае асяроддзе, дзе памылкі разглядаюцца як штуршок да навучання, пошуку новых рашэнняў, развіцця настойлівасці і ўстойлівасці.
- займае больш часу, таму для прыняцця правільных рашэнняў аб адукацыйных выніках, дасягнутых вучнем, прамежкавыя ацэнкі павінны быць арыентаваны на якасную зваротную сувязь, пазбягаючы лічбавага выражэння ацэнкі.

**Эфектыўныя практыкі, якія заснаваны на развіцці ключавых кампетэнцый, маюць станоўчыя вынікі ў наступных сферах:**

- абнаўленне зместу навучання на аснове ключавых кампетэнцый;
- кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы да навучання, якія заснаваны на праектных, творчых, даследчых, эксперыментальных метадах і міждысцыплінарным навучанні праз дзейнасць;
- стварэнне спрыяльнага навучальнага асяроддзя з фокусам на сацыяльны дабрабыт і эмацыянальны дабрабыт і здароўезберагальную фізічную актыўнасць;
- падтрымка педагогаў: уключэнне ў базавую падрыхтоўку і перападрыхтоўку настаўнікаў курсаў пра кампетэнтнасна-арыентаваныя падыходы і методыкі, доступ да экспертных цэнтраў і апошніх даследаванняў, наяўнасць неабходных дапаможнікаў і матэрыялаў у спалучэнні з рознымі варыятыўнымі магчымасцямі і аўтаномнасцю ў арганізацыі навучання;
- ацэньванне і праверка сфармаванасці кампетэнцый: дэталёвы пераклад ключавых кампетэнцый у структурныя мадэлі вынікаў навучання і стварэнне адпаведнага інструментарыя, комплекснае выкарыстанне фарматыўнага і падсумавальнага ацэньвання.